УДК 930 (476) (1921 – 1939)

***А.С. Горны***
*аспірант каф. гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы*

# БЕЛАРУСКІЯ ПАЛАНАФІЛЬСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1937 гг.): АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ СТРУКТУРА І ПРАГРАМНЫЯ МЭТЫ

*Артыкул прысвечаны праблеме дзейнасці ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд беларускіх паланафільскіх арганізацый і партый. Галоўная ўвага надаецца аналізу арганізацыйнай структуры паланафільскай плыні беларускага руху і разгляду палітычных праграм Краёвай сувязі, Часовай беларускай рады, Беларускай радыкальнай народнай партыі, групы Луцкевіча – Астроўскага і іншых арганізацый. Зроблены высновы аб адсутнасці ў беларускіх паланафілаў моцнай арганізацыйнай структуры.*

У міжваенны перыяд у Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Польшчы, назіралася станаўленне розных плыняў беларускага нацыянальнага руху. Аб'яднаныя ідэяй злучэння беларускіх земляў, многія дзеячы, тым не менш, па-рознаму глядзелі на іх будучыню. Частка беларускай палітычнай эліты прытрымлівалася незалежніцкіх поглядаў і абапіралася на нацыянальна-дэмакратычныя ідэалы Беларускай народнай рэспублікі. Іншая (даволі прадстаўнічая) частка, выказваючы левыя погляды, заклікала змагацца за далучэнне Заходняй Беларусі да БССР. Аднак у гэты перыяд выкрышталізоўвалася і яшчэ адна плынь беларускага руху, якая бачыла будучыню Беларусі толькі ў моцным саюзе з Польскай дзяржавай. На тагачасным палітычным лексіконе яна атрымала назву «беларускага паланафільства». Гэтая плынь, як і дзве вышэй адзначаныя, імкнулася стварыць сваю арганізацыйную структуру і распаўсюдзіць уплыў на шырокія слаі беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі.

У айчыннай гістарыяграфіі некаторыя аспекты дзейнасці беларускіх паланафілаў былі закрануты ў працах А. Чарнякевіча [1], А. Пашкевіча [2] і А. Вабішчэвіча [3]. Таксама гісторыю беларускага паланафільства спрабавалі асэнсаваць польскія даследчыкі К. Гамулка [4] і І. Янушэўская-Юркевіч [5]. Аднак нягледзячы на пэўныя напрацоўкі, дзейнасць беларускіх паланафільскіх арганізацый па-ранейшаму з'яўляецца маладаследаваным пытаннем навейшай гісторыі Беларусі. Глыбокага асэнсавання патрабуюць, перад усім, пытанні арганізацыйнай структуры беларускага паланафільства і яго палітычнай платформы.

Першай паланафільскай арганізацыяй, якая пачала дзейнічаць на заходнебеларускіх землях пасля польска-савецкай вайны, была Краёвая сувязь. Яна разгарнула сваю дзейнасць у межах непрызнанага дзяржаўнага ўтварэння «Сярэдняя Літва», што існавала на землях этнаграфічнай Віленшчыны ў 1920–1922 гг. Афіцыйна арганізацыя была заснавана 24 красавіка 1921 г. у Вільні падчас агульнага сходу паланафільскіх дзеячоў [6, арк. 15]. На сходзе была прынята дэкларацыя, дзе прапісваліся асноўныя праграмныя тэзісы Краёвай сувязі. Яе мэтамі вызначаліся абуджэнне беларускай свядомасці ў духу краёвага саюза з Польшчай, дамаганне правоў для народа Сярэдняй Літвы свабодна вырашаць свой лёс праз заканадаўчыя органы, барацьба з Савецкай Расіяй як крыніцай імперыялізму і інш. [6, арк. 15]. Кіраўнічым органам арганізацыі з'яўляўся, утвораны ў маі 1921 г. Цэнтральны камітэт, у склад якога ўваходзілі В. Пупка (старшыня), П. Аляксюк (віцэ-старшыня), А. Біруковіч (сакратар), В. Шышкоў (скарбнік), Я. Бекіш і А. Кабычкін [7, арк. 9]. Рэальным лідарам паланафілаў з'яўляўся П. Аляксюк, які фактычна самастойна кантраляваў усе сферы дзейнасці Краёвай сувязі.

Дзеячы Краёвай сувязі не змаглі распрацаваць канкрэтны праграмны дакумент арганізацыі. Тым не менш з мая 1921 г. выдаваўся друкаваны орган Краёвай сувязі – газета «Jedność», на старонках якой друкаваліся палітычныя ідэі паланафілаў. Арганізацыя актыўна выкарыстоўвала ў сваёй дзейнасці лозунгі краёвасці, распаўсюджаныя на беларускіх землях у пачатку XX ст., галоўным з якіх быў тэзіс пра дасягненне згоды ўсіх народаў краю [8, s. 1] (на пячатцы Краёвай сувязі назва арганізацыі была напісана на трох мовах: польскай, літоўскай і беларускай). Аднак гэтая краёвая рыторыка паступова пераходзіла ў палітычнае паланафільства. Прадстаўнікі арганізацыі выступалі за далучэнне беларускіх земляў да Польшчы на правах аўтаномнай адзінкі [6, арк. 15]. «З нашым найбліжэйшым суседам – польскім народам жадаем узнаўлення гістарычнай злучнасці», – падкрэслівалася ў адным з артыкулаў паланафільскай газеты [9, s. 1]. Значнае месца ў праграмных пастулатах Краёвай сувязі займаў антыбальшавізм.

У першыя месяцы існавання Краёвая сувязь ажыццявіла на тэрыторыі Сярэдняй Літвы і за яе межамі пэўныя арганізацыйныя крокі. Мясцовыя філіялы арганізацыі былі створаны ў шэрагу мястэчак і гарадах Заходняй Беларусі: у Мураванай Ашмянцы, Залессі, Глыбокім, Радашковічах, Нясвіжы, Сіняўцы, Баранавічах, Слоніме, Гродне і інш., аднак большасць з гэтых філіялаў існавала толькі намінальна. Асноўную ўвагу прадстаўнікі Краёвай сувязі звярталі на кааператыўны рух. Пад іх кантролем знаходзіліся каля сямі віленскіх кааператываў, аптовы склад, пякарня, кааператыўныя аддзелы ў некалькіх мястэчках краю [7, арк. 9адв.]. Акрамя гэтага, паводле ўласных сведчанняў паланафілаў, Краёвая сувязь здолела адчыніць у Заходняй Беларусі 52 беларускія школы, якія падтрымлівала матэрыяльна [10, с. 3]. Тым не менш, як падкрэсліваў пазней кіраўнік віленскай паліцыі, большасць гэтых школ існавала толькі на паперы, а ў астатніх працавалі беларускія эсэры, варожа настроеныя да паланафільства [7, арк. 9адв.].

Каб набраць галасоў беларускага насельніцтва Віленшчыны напярэдадні выбараў у Віленскі сейм, дзеячы Краёвай сувязі 11–12 снежня 1921 г. склікалі ў Вільні «з’езд беларускага сялянства, партый і арганізацый Заходняй Беларусі». Нягледзячы на гучную назву, на з’ездзе не былі прадстаўлены тагачасныя найбольш уплывовыя беларускія арганізацыі, а большасць дэлегатаў, якія нікім не абіраліся, прытрымліваліся паланафільскіх поглядаў, напрыклад, прадстаўнікі Беларускага палітычнага камітэта і партыі «Зялёны дуб» [11, № 2, с. 2]. Даслаўшы маршалу Пілсудскаму і іншым вышэйшым польскім чыноўнікам прывітальныя тэлеграмы, старшыня з’езду П. Аляксюк пацвердзіў ідэалы польска-беларускага саюза [11, № 1, с. 2–3]. Акрамя гэтага, прыхільнікі Краёвай сувязі заклікалі ўлады не чыніць перашкодаў у пашырэнні беларускіх школ, аказаць матэрыяльную дапамогу бежанцам, рацыянальна выкарыстоўваць лясное багацтва Беларусі, правесці зямельную рэформу і перадаць зямлю мясцовым сялянам, перад усім беззямельным і малазямельным [6, арк. 126–131].

Нягледзячы на агітацыйную дзейнасць і падтрымку з боку польскіх уладаў, Краёвая сувязь не змагла пашырыць свого ўплыву на беларускае насельніцтва Заходняй Беларусі. Падчас выбараў у сейм Сярэдняй Літвы, якія адбыліся ў студзені 1922 г., выбарчыя спісы арганізацыі не карысталіся поспехам, і паланафілы пацярпелі поўнае паражэнне [12, с. 27]. Неўзабаве пасля выбараў Краёвая сувязь паступова развалілася. Затым перасталі існаваць мясцовыя аддзелы і кааператывы, падкантрольныя арганізацыі.

У 1922 г. частка беларускіх паланафілаў актывізавала сваю працу на тэрыторыі Гродзеншчыны. Лідарам гэтай групы, якая ў асноўным складалася з былых сябраў партыі «Зялёны дуб», з’яўляўся Я. Міткевіч [13, с. 96]. У пачатку 1922 г. разам са сваімі прыхільнікамі ён утварыў Арганізацыю беларускіх беспартыйных актывістаў (АББА). Паводле сцверджанняў Міткевіча, яго арганізацыя брала свой пачатак з вышэй згаданага «з’езда беларускага сялянства, партый і арганізацый Заходняй Беларусі» 1921 г., на якім частка дэлегатаў утварыла фракцыю «беспартыйных актывістаў» [14, арк. 1].

Каб надаць пэўную легітымнасць АББА, паланафілы склікалі 23 красавіка 1922 г. «беларускі з'езд прадстаўнікоў Гарадзенскага павета». У распрацаванай на з'ездзе рэзалюцыі было выказана асуджэнне П. Алексюку за тое, што ён павёў працу Краёвай сувязі ў шкодным напрамку, і прынята пастанова аб падтрымцы палітычнай платформы АББА, якая вядзе «да цеснага аб'яднаньня з братнім польскім народам». У Цэнтральны прэзідыум АББА ўвайшлі Я. Міткевіч (старшыня), Я. Шурпа (сакратар), Я. Цлоўка, У. Фёдараў, Я. Манюта і інш. [13, с. 100; 15, с. 3].

Стваральнікі АББА абапіраліся ў сваёй дзейнасці на мінімум праграмных патрабаванняў. Яны дамагаліся рэалізацыі культурных правоў і паляпшэння эканамічнага становішча беларускага насельніцтва ў Польшчы [13, с. 100]. Дзеля гэтага Цэнтральны прэзідыум АББА ажыццяўляў рэгістрацыю аграномаў і настаўнікаў, якія вярталіся на Гродзеншчыну з бежанства [16, с 2]. Тым не менш асноўным палітычным крэда арганізацыі была ідэя лаяльнасці да Польскай дзяржавы. «Актывісты» імкнуліся дапамагаць польскім уладам у барацьбе з пракамуністычнымі элементамі і беларускімі нацыянальна-дэмакратычнымі арганізацыямі, у першую чаргу, з Беларускім нацыянальным камітэтам у Вільні [13, с. 101].

Згодна з данясеннямі польскіх спецслужбаў, АББА мела значны ўплыў на грамадска-палітычные жыццё Гродзеншчыны, а ў некаторых мясцовасцях змагла выцесніць нават беларускія антыпольскія арганізацыі [13, с. 101]. Аднак гэтая ацэнка здаецца нам даволі завышанай і неаб'ектыўнай. Можна дапусціць, што ўяўленні польскіх спецслужбаў аб дзейнасці АББА абапіраліся на дадзеныя саміх паланафілаў, якія нярэдка перабольшвалі ступень свайго уплыву. У рэальнасці паланафільская арганізацыя знаходзілася на перэферыі палітычнага жыцця краю. Падчас парламенцкіх выбараў 1922 г. АББА, выставіўшы выбарчыя спісы ў Лідскай і Віленскай акругах, панесла паражэнне: за паланафілаў было ададдзена ўсяго каля 70 галасоў [2, s. 162–163]. Дзейнасць АББА рэзка крытыкавалася з боку іншых беларускіх арганізацый і перыядычных выданняў, якія лічылі Я. Міткевіча «дэфензіўшчыкам», які працуе «за панскія грошы» [17, s. 2]. Фактычна з канца 1922 г. арганізацыя не праяўляла якой-небудзь значнай актыўнасці. Выключэннем можа быць толькі выданне паланафіламі ў 1923 г. у Гродне газеты «Селянская гутарка» і спроба некаторых «актывістаў» усталяваць кантроль над гродзенскім беларускім прытулакам і іншымі дабрачыннымі ўстановамі горада [18, s. 5].

У 1924 г. вектар развіцця беларускага паланафільскага руху зноў перамясціўся ў Вільню. У гэты час назіралася кансалідацыя шэрагу беларускіх дзеячоў прапольскай арыентацыі вакол Беларускага грамадзянскага схода. Гэтая арганізацыя, якая была ўтворана ў Вільні ў 1911 г. як інтэлігенцкі клуб, адыграла вельмі важную ролю ў выбарчай кампаніі 1922 г. у польскі парламент і пашырэнні беларускіх уплываў на Віленшчыне. Аднак у адзначаны перыяд унутры Беларускага грамадзянскага сходу ўзнікла т.зв. польская партыя, на чале якой стаяў адыёзны беларускі дзеяч з крымінальным мінулым С. Валейша [19, с. 2]. Яго прыхільнікі цалкам кантралявалі арганізацыю, якая паступова пераўтварылася ў звычайнае казіно [20, арк. 329]. Разам з тым Валейша планаваў аказваць уплыў і на палітычнае жыццё краю. 21 верасня 1924 г. ён сумесна з групай аднадумцаў склікаў «канферэнцыю прадстаўнікоў беларускіх дэмакратычных партый, сялянства і інтэлігенцыі». Раскрытыкаваўшы дзейнасць Беларускага пасольскага клуба ў польскім сейме і Беларускага нацыянальнага камітэта, паланафілы пастанавілі ўтварыць Часовую беларускую раду (ЧБР) [21, арк. 5]. ЧБР павінна была ўвайсці ў кантакт з польскімі ўладамі і грамадскімі арганізацыямі дзеля забеспячэння правоў беларускага насельніцтва, гарантаваных польскай канстытуцыяй. Прэзідыум ЧБР склалі: старшыня – А. Паўлюкевіч, віцэ-старшыні – Г. Канапацкі і У. Більдзюкевіч, сакратары – В. Шышкоў і А. Кабычкін, член з правам рашучага голаса – С. Валейша [21, арк. 5адв.].

Прысутнасць прыметніка «часовая» ў назве арганізацыі тлумачылася тым, што яна павінна была ў бліжэйшым часе склікаць агульны «з’езд Заходняй Беларусі», дзе, згодна з планамі паланафілаў, было б абрана сталае прадстаўніцтва беларусаў у Польшчы [21, арк. 5]. Скліканне з’езда, аднак, доўгі час адкладвалася з-за адстутнасці ў ЧБР неабходных сродкаў. Арганізацыя не мела распрацаванай праграмы, але час ад часу яе сябры публікавалі на старонках газет некаторыя тэзісы сваёй палітычнай платформы. Так, паланафілы прызнавалі польскую дзяржаўнасць, заклікалі беларусаў лаяльна адносіцца да інстытутаў гэтай дзяржаўнасці, дамагаліся абвяшчэння аўтаноміі Заходняй Беларусі, правядзення зямельнай рэформы і скасавання асадніцтва, заклікалі да нацыянальнай і класавай згоды ўсіх жыхароў «усходніх крэсаў». Цікавым праграмным патрабаваннем сяброў ЧБР было вызваленне Усходняй Беларусі ад бальшавікоў і далучэнне яе да Польшчы [22, с. 1]. Паланафілы актыўна крытыкавалі дзейнасць амаль усіх беларускіх арганізацый, апазіцыйна настроеных да польскіх уладаў, у першую чаргу камуністаў і беларускіх паслоў польскага парламента. Дэпутатаў дзеячы ЧБР асабліва востра абвінавачвалі ў дэструктыўнай рабоце і распаўсюджванні рэвалюцыйных настрояў сярод беларусаў Польшчы [23, с. 2]. Нярэдка крытыка паланафілаў пераходзіла дапушчальныя межы і пераўтваралася ў звычайныя паклёпы і зняважлівыя.

Сваі ідэі прадстаўнікі ЧБР імкнуліся распаўсюдзіць на правінцыю. На працягу 1925–1927 гг. Рада ўтвалыла шэраг сакратарыятаў у гарадах, мястэчках і вёсках Віленскага, Навагрудскага і Беластоцкага ваяводстваў. Так, сакратарыяты арганізацыі існавалі ў гарадах Гродна, Баранавічы, Нясвіж, Клецк, Ліда, Дзятлава, вёсках Сіняўка Нясвіжскага павета, Уша Маладзечанскага павета [24, арк. 36 – 37; 25, арк. 170, 194]. Але большасць з іх фактычна бяздзейнічала ці не аказвала значнага ўплыву на мясцовае грамадска-палітычнае жыццё. На чале сакратарыятаў стаялі ў асноўным прадстаўнікі мясцовай беларускай інтэлігенцыі без дакладна акрэсленай ідэалогіі, але з выразнымі антыкамуністычнымі поглядамі. Напрыклад, баранавіцкі сакратарыят ЧБР узначальваў былы ўдзельнік Слуцкага паўстання 1920 г. Н. Кернажыцкі [13, с. 305]. У Лідзе за ЧБР актыўна агітаваў праваслаўны святар У. Кірык, які распаўсюджваў улёткі арганізацыі і ў царкве заклікаў моладзь не далучацца да камуністычных груповак [26, с. 6; 27, с. 4].

Нярэдка прадстаўнікі беларускіх радыкальных плыняў выкарыстоўвалі сакратарыяты ЧБР дзеля ажыццяўлення легальнай працы, пазбягаючы такім чынам пераследванняў з боку польскай паліцыі. Так, сакратарыят паланафільскай арганізацыі, які быў створаны ў 1925 г. ў в. Казлоўшчына Слонімскага павета, фактычна цалкам складаўся з дзеячоў антыпольскай скіраванасці. Сакратаром гэтага аддзела быў вядомы ў будучым пісьменнік С. Сіняк (Хмара). Паводле яго ўспамінаў, рашэнне аб арганізацыі сакратарыята было прынята з мэтай «замаскіраваць» ад паліцыі дзейнасць мясцовага беларускага актыву [28]. Гэты крок дазволіў Сіняку і яго аднадумцам без перашкод заснаваць бібліятэку, арганізоўваць беларускія спектаклі і канцэрты, дамагацца адкрыцця беларускіх школ і правядзення беларусізацыі царкоўнага жыцця. Летам 1926 г. аддзел ЧБР у Казлоўшчыне перайшоў пад кантроль Беларускай сялянска-работніцкай грамады.

27–28 чэрвеня 1926 г. Часовая беларуская рада з мэтай дэманстрацыі сваёй палітычнай праграмы і пашырэння ўплыву арганізавала ў Вільні т.зв. «з’езд Заходняй Беларусі». На мерапрыемстве прысутнічала каля 100 чалавек, у тым ліку 40 дэлегатаў з правінцыі [29, арк. 14]. Нягледзячы на такую колькасць, многія з правінцыйных прадстаўнікоў былі апазіцыйна настроены да дзейнасці паланафілаў і асабіста Паўлюкевіча. На з’ездзе не прысутнічалі ані беларускія паслы польскага парламента, ані ўпаўнаважаныя ад іншых беларускіх арганізацый і партый. Распачынаючы мерапрыемства, арганізатары даслалі прывітальныя тэлеграмы на адрас прэзідэнта Польшчы І. Масціцкага, маршала Ю. Пілсудскага, прэм’ер-міністра К. Бартля, віленскага ваяводы У. Рачкевіча, у якіх заклікалі польскія ўлады ісці насустрач жаданям беларускага народа [30, с. 1].

У сваіх прамовах лідары паланафілаў падкрэслілі, што будуць імкнуцца да ажыццяўлення беларускіх нацыянальных ідэалаў разам з прадстаўнікамі польскай дэмакратыі. Дзеля гэтага Часовая беларуская рада была пераўтворана ў Беларускую нацыянальную раду, якую паланафілы прапанавалі лічыць «сталым пазапарламентарным прадстаўніцтвам беларусаў у Заходняй Беларусі» [30, с. 2]. Былі прынятыя рэзалюцыі па палітычным, зямельным, школьным і рэлігійным пытаннях.

Нягледзячы на актывізацыю працы і гучную назву, Беларуская нацыянальная рада ўжо ў другой палове 1926 г. сутыкнулася з шэрагам праблемаў. У верасні з яе складу выйшаў вядомы беларускі пісьменнік і тэатральны дзеяч Ф. Аляхновіч [13, с. 315]. Праз месяц Раду пакінулі А. Кабычкін і шэраг іншых паплечнікаў Паўлюкевіча. Неўзабаве яны арганізавалі ініцыятыўную групу па ўтварэнні «Беларускага нацыянальна-дэмакратычнага аб'яднання», аднак гэты праект так і застаўся на паперы [31, арк. 61адв.]. Многія з членаў ЧБР былі незадаволены самаўладнымі паводзінамі Паўлюкевіча, які самастойна распараджаўся фінансамі арганізацыі і не выплачваў грошай сваім супрацоўнікам. Напрыклад, старшыня ЧБР пасля атрымання субсідыі ад Дэлегатуры польскага ўраду ў Вільні забраў сабе каля 800 злотых у якасці пенсіі, астатнія грошы расходаліся безгаспадарча: на вялікую арэндную плату і іншыя выдаткі [24, арк. 76]. Такія акалічнасці прымушалі найбольш актыўных дзеячоў пакідаць шэрагі гэтай паланафільскай арганізацыі. У пачатку 1928 г. па прычыне ўнутранага і фінансавага канфліктаў з пасады старшыні Беларускай нацыянальнай рады сышоў А. Паўлюкевіч. Фактычна пасля гэтага арганізацыя перастала існаваць і знікла з палітычнай сцэны Заходняй Беларусі.

У пачатку 1927 г. у Беларускай нацыянальнай рады з'явіўся сур'ёзны канкурэнт па паланафільскай дзейнасці. У гэты час пасля разгрому Беларускай сялянска-работніцкай грамады польскі ўрад планаваў пэўным чынам зменшыць палітычную напружанасць у паўночна-ўсходніх ваяводствах і арганізаваць выданне праўрадавага беларускага часопіса, вакол якога згуртавалася б група паланафільскай інтэлігенцыі. Па прапанове вядомага польскага публіцыста і грамадскага дзеяча Л. Васілеўскага лідарам гэтай групы стаў беларускі пісьменнік Ф. Умястоўскі [32, с. 1]. Можна дапусціць, што група Умястоўскага павінна была кантраляваца непасрэдна варшаўскімі ўладамі ў супрацьвагу Беларускай нацыянальнай радзе, якую курыравала Віленскае ваяводскае ўпраўленне і асабіста ваявода У. Рачкевіч [33, с. 38].

7 сакавіка 1927 г. Ф. Умястоўскі распачаў выданне ў Вільні часопіса «Беларускі дзень». Паступова вакол яго згуртавалася кола прыхільнікаў, куды ўвайшлі былы камуніст лідар т.зв. «сэцэсіі» КПЗБ М. Гурын, публіцыст і літаратар Макар Касцевіч (Макар Краўцоў), Ф. Цяўлоўскі, Я. Міткевіч, Я. Бартуль, А. Зянюк інш. [34, s. 7–8]. Часопіс актыўна прапагандаваў ідэю беларуска-польскага «братэрскага» супрацоўніцтва па ўзоры філаматаў і філарэтаў XIX ст., заклікаў да шырокай культурніцка-гаспадарчай працы сярод беларускага насельніцтва, а таксама крытыкаваў савецкую палітычную і эканамічную сістэму. 25 кастрычніка 1927 г. у Вільні была склікана «канферэнцыя» карэспандэнтаў і прыхільнікаў часопіса, падчас якой было вырашана ўтварыць на базе групы новую праўрадавую арганізацыю – Беларускую радыкальную народную партыю (БРНП) [35, s. 2]. Нягледзячы на наяўнасць у назве слова «радыкальны» (што рабілася спецыяльна для прыцягненя ўвагі сялянства), ідэалогія партыі не вылучалася патрабаваннямі кардынальных зменаў у палітычным і эканамічным жыцці Заходняй Беларусі. Яе праграма ўтрымлівала наступныя тэзісы: 1) стварэнне спрыяльных варункаў на «ўсходніх крэсах» для трывалага развіцця гаспадаркі і культуры мясцовага беларускага насельніцтва; 2) прадастаўленне ўсходнім ваяводствам Польшчы тэрытарыяльнай аўтаноміі з краёвым соймам у Вільні; 3) забеспячэнне правоў беларускай меншасці ў Польшчы на падставах польскага заканадаўства і Канстытуцыі [34, s. 7–8]. Як падкрэслівалася ў адной

з партыйных улётак, усяго гэтага неабходна здабываць легальна, «шануючы Польскую дзяржаўнасьць і яе прадстаўніка Маршалка Пілсудскага» [36, арк. 6адв.].

Кіраўнічым органам БРНП з’яўляўся Выканаўчы камітэт, на чале якога стаяў Ф. Умястоўскі. На сваім першым паседжанні 26 кастрычніка 1927 г. камітэт пастанавіў разаслаць у правінцыю дакументы для адкрыцця мясцовых аддзелаў партыі і пачаць арганізацыю культурна-спартыўнага таварыства «Сокал». Агітатары паланафілаў неўзабаве пачалі працаваць у Гродне, Баранавічах, некалькіх вёсках і мястэчках Гродзенскага, Навагрудскага і Дзісненскага паветаў [37, с. 2–3]. У лістападзе 1927 г. партыя далучылася да Краёвага народнага саюза літоўска-беларускіх земляў «Аб’яднанне», куды ўваходзілі некалькі польскіх сялянскіх арганізацый – актыўных прыхільнікаў палітыкі Пілсудскага [38, арк. 28]. Тым не менш БРНП па прычыне сваіх празмерна лаяльных адносін да польскіх уладаў не карысталася вялікай падтрымкай з боку беларускага грамадства і апынулася на перэферыі палітычнага жыцця краю. Пра гэта яскрава сведчыць выпадак у мястэчку Турэц, калі мясцовыя сяляне прагналі агітатара з БРНП, палічыўшы яго словы падманам, а самога паланафіла – агентам дэфензівы [39, с. 6]. Гэтыя акалічнасці выявілі ідэйную слабасць групы Умястоўскага, ад якой пaступова пачалі адыходзіць апошнія прыхільнікі. У кастрычніку 1928 г. Умястоўскі спыніў сваю дзейнасць і знік з палітычнай арэны настолькі імгненна, як і з’явіўся.

У 1920-я гг. у Заходняй Беларусі дзейнічала яшчэ некалькі дробны беларускіх паланафільскіх груп. Сярод іх заслугоўвае ўвагі Цэнтральны камітэт па беларускіх справах (ЦКБС). Гэта арганізацыя была ўтворана ў верасні 1924 г. у Варшаве і аб’ядноўвала вакол сябе былых дзеячоў з партыі «Зялёны дуб» і Арганізацыі беларускіх беспартыйных актывістаў. На чале яе стаяў малавядомы ў беларускім руху дзеяч Ф. Цяўлоўскі [13, с. 316]. У сваёй праграме ЦКБС вылучаў памкненні да шырокага беларуска-польскага супрацоўніцтва, паляпшэння эканамічнага становішча беларусаў і барацьбы з пракамуністычнымі і беларускімі нацыянальна-дэмакратычнымі сіламі [1, с. 68].

Распачынаючы сваю палітычную кампанію, Цяўлоўскі актыўна шукаў спонсараў і апекуноў. У лістападзе 1924 г. ён прапанаваў польскай дэфензіве выкарыстовываць ЦКБС у вывядоўчых і прапагандысцкіх мэтах на «крэсах», але атрымаў адмову [1, с. 68]. Аднак на яго звярнулі ўвагу ў Міністэрстве ўнутраных спраў. Тут вырашылі зрабіць стаўку на ЦКБС і з яго дапамогай стварыць ў паўночна-ўсходніх ваяводствах Польшчы падкантрольны беларускі рух. Гэтую ідэю падтрымліваў чыноўнік міністэрства па прозвішчы Руткоўскі, які, не маючы ніякага ўяўлення аб асаблівасцях беларускага палітычнага жыцця, пачаў фінансаваць арганізацыю Цяўлоўскага [40, s. 253].

У канцы 1924 г. Цяўлоўскі выехаў у Заходнюю Беларусь дзеля ажыццяўлення сваёй дзейнасці ў асноўным на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства. Тут, паводле рэкамендацыі МУС, ён павінен быў выхоўваць мясцовае насельніцтва «ў духу, прыхільным да Польскай дзяржавы» [41, арк. 3]. У мястэчках і вёсках ваяводства, у асноўным падчас кірмашоў, Цяўлоўскі ад імя ЦКБС ладзіў лакальныя мітынгі, дзе агітаваў супраць Беларускага пасольскага клуба, камуністаў і іх прыхільнікаў, заклікаў дапамагаць уладам у барацьбе з партызанамі і г.д. Аднак гэтыя мерапрыемствы не карысталіся асаблівым поспехам сярод насельніцтва. Напрыклад, падчас мітынгу ў Ляхавічах адзін з прысутных падкрэсліў, што Цяўлоўскі працуе за польскія грошы і не мае ніякага ўяўлення аб сялянскіх праблемах, бо апрануты ў дарагія боты і футра [42, арк. 229]. Таксама беспаспяховай была спроба стварыць мясцовыя аддзелы ЦКБС у гарадах краю, таму што вакол арганізацыі пачалі гуртавацца амаральныя асобы і прагныя да грошай авантурысты. Р. Зямкевіч, канфідэнт польскай дэфензівы, у сваім рапарце так характарызаваў «дзейнасць» гродзенскага аддзела ЦКБС: «Камітэт складваўся з крымінальных элементаў. Іх палітычная дзейнасць цалкам фікцыйная. Пьюць, ужываюць какаін, нічога не ро-

бяць. Ніякага ўплыву ня маюць» [40, s. 253]. Праваліўшы сваю акцыю, Цяўлоўскі ў канцы 1925 г. ліквідаваў ЦКБС і перайшоў у іншую палітычную арганізацыю.

Фактычна ў канцы 1920-х гг. пасля развалу ўсіх паланафільскіх арганізацый прапольская плынь беларускага нацыянальнага руху не мела выразнага арагнізацыйнага афармлення і знаходзілася ў глыбокім ідэалагічным крызісу. Адсутнасць шырокай падтрымкі паланафільскіх ідэй з боку беларускага насельніцтва была ў значнай ступені абумоўлена палітыкай паланізацыі, якую праводзіў польскі ўрад у Заходняй Беларусі. Немалаважную ролю ў адсутнасці попыту на паланафільства адыгрываў і той фактар, што паланафільскі рух узначальвалі малавядомыя дзеячы з сумніўнай рэпутацыяй, якія займаліся не столькі палітыкай, колькі палітычным бізнесам. На рубяжы 1920–1930-х гг. ім на змену прыйшла новая фармацыя палітыкаў, якія зрабілі спробу павярнуць праўрадавую плынь у канструктыўнае рэчышча.

Пасля ліквідацыі польскімі ўладамі ў 1927 г. Беларускай сялянска-работніцкай грамады група беларускіх дзеячоў вырашыла аддзяліць культурную працу ад палітыкі. З успамінаў А. Луцкевіча, ініцыятарам такой змены ў тактыцы барацьбы выступаў Б. Тарашкевіч, які на той час знаходзіўся ў польскай турме [43, с. 256]. Паводле разлікаў, неабходна было засяродзіцца на дзейнасці культурна-асветніцкіх арганізацый і спрабаваць знайсці кампраміс з польскімі ўладамі, а менавіта з санацыйным урадам Пілсудскага, каб пазбегнуць далейшых рэпрэсій у адносінах да беларускага руху ў Польшчы. Ажыцыцяўляць гэтыя ідэі было наканавана дзеячам, вызваленым з-пад арышту пасля працэса над Грамадой, у прыватнасці, А. Луцкевічу, Р. Астроўскаму, Я. Шнаркевічу [43, с. 257]. Свае пазіцыі А. Луцкевіч абгрунтоўваў наступным чынам: «Трэба выкарыстоўваць усякія магчымасці, каб змагацца з дэнацыяналізацыяй» [44, с. 4].

Пачатак дзейнасці згаданай групы можна аднесці да лютаўскіх падзеяў 1929 г. у Віленскай беларускай гімназіі. Тады дырэктар гімназіі Р. Астроўскі выключыў з яе некалькі вучняў, падазраваных у камуністычнай агітацыі, праводзячы тым самым лінію аддзялення школьніцтва ад палітыкі [45, с 176]. Таксама ў маі 1929 г. частка сяброў Таварыства беларускай школы (ТБШ) пачала актыўна дамагацца «дэпалітызацыі» арганізацыі. На нелегальным з’ездзе ТБШ 19 мая 1929 г. гэтыя дзеячы былі абвінавачаны ў «шкоднай дзейнасці» і выключаны са складу таварыства [3, с. 47; 43, с. 258]. Паступова ў беларускай нацыянальна-дэмакратычнай і левай прэсе пачалася вострая крытыка дзейнасці гэтай групы, якая за свае памяркоўныя пазіцыі і спробы «аздараўлення» мясцовага палітычнага жыцця атрымала назву «беларускай санацыі» (адзін з першых фактаў выкарыстання гэтага азначэння сустракаецца ў газеце «Беларуская крыніца» за 14 ліпеня 1929 г. – *А.Г.*). У айчыннай гістарыяграфіі замест тэрміна «беларуская санацыя» нярэдка выкарыстоўваецца іншае найменне – група Луцкевіча – Астроўскага.

У канцы 1929 г. група пачала выдаваць газету «Наперад», дзякуючы якой пашырала ідэю т.зв. «пазітыўнай працы». У агульным плане «беларуская санацыя» адмаўлялася ад радыкальных метадаў барацьбы і заклікала беларусаў займацца актыўнай культурна-асветніцкай дзейнасцю, у прыватнасці, пашырэннем сеткі беларускіх школ. Нацыянальную працу неабходна было ажыцяўляць выключна канстытуцыйным шляхам [46, с. 1]. Таму дзеячы групы Луцкевіча – Астроўскага імкнуліся наладзіць кантакты з польскімі ўладамі, каб паказаць, што беларусы з’яўляюцца раўнапраўнымі грамадзянамі Польшчы і таму маюць права на падтрымку свайго нацыянальна-культурнага развіцця з боку дзяржавы. Гэтыя погляды былі агучаны, напрыклад, падчас сустрэчы прадстаўнікоў групы з прэзідэнтам Польшчы І. Масьціцкім у чэрвені 1930 г. [47, с. 184].

Каб надаць сваёй дзейнасці арганізацыйную форму, прадстаўнікі «беларускай санацыі» ўтварылі ў жніўні 1930 г. Цэнтральны саюз беларускіх культурна-асветных і гаспадарчых арганізацый і інстытуцый (Цэнтрасаюз), мэтай якога абвяшчалася развіццё і сумесная каардынацыя культурнай, грамадскай і гаспадарчай працы беларускага

насельніцтва ў Польшчы. Як заўважыў Ю. Туронак, Цэнтрасаюз павінен быў стаць своеасаблівым «холдынгам», які аб'ядноўваў бы з цягам часу шматлікія культурныя арганізацыі памяркоўнага характару [48, с. 288]. Падчас устаноўчага сходу 27 верасня 1930 г. у Цэнтрасаюз увайшлі наступныя таварыствы і суполкі: Беларускае навуковае таварыства, Беларускі настаўніцкі саюз, Аб'яднанне беларускіх жанчын, Беларускае дабрачыннае таварыства, Бацькоўскія камітэты Віленскай, Наваградскай і Клецкай гімназій, Беларускі гаспадарчы звяз, кааператывы «Спулдзельца» і «Пчала», рэдакцыя часопіса «Саха». У прэзідыўм Галоўнай рады Цэнтрасаюза былі абраны А. Трэпка (старшыня), Р. Астроўскі (скарбнік), Ф. Акінчыц (сакратар), С. Кароль, І. Цеханоўскі і інш. [49, арк. 58].

Пры ўдзеле Цэнтрасаюза на тэрыторыі Заходняй Беларусі было адчынена каля 16 бібліятэк-чытальняў, арганізаваны шэраг адукацыйных лекцый, выдадзены некалькі брашур антысавецкай скіраванасці [48, с. 288; 50, с. 43–44]. Намаганнямі Р. Астроўскага «беларуская санацыя» кожны месяц атрымлівала ад уладаў фінансавую субсідыю памерам 6 500 злотых, якая размяркоўвалася паміж арганізацыямі, аб'яднанымі ў Цэнтрасаюз [51, арк. 17]. Тым не менш дзейнасць Луцкевіча і Астроўскага, якая шмат у чым праходзіла толькі ў межах віленскага культурнага асяроддзя, не карысталася шырокай падтрымкай з боку беларусаў і пастаянна крытыкавалася левымі і нацыянальна-дэмакратычнымі групамі. Паступова па прычыне асабістых канфліктаў і адсутнасці рэальных вынікаў працы з Цэнтрасаюза пачалі сыходзіць найбольш актыўныя прадстаўнікі, у прыватнасці, Ф. Акінчыц і Я. Станкевіч [49, арк. 43]. Няздольнасць Цэнтрасаюза абараніць Клецкую беларускую гімназію, якую ўлады зачынілі ў чэрвені 1931 г., канчаткова паказала слабасць і недзеяздольнасць арганізацыі.

У канцы 1932 г. на месцы Цэнтрасаюза была створана новая арганізацыя – Таварыства беларускай асветы (ТБА), якая абвясціла выключна культурныя мэты распаўсюджвання роднай асветы [51, арк. 20]. Кіраўніцтва ТБА цесна супрацоўнічала і ўзгадняла сваю дзейнасць з мясцовымі адміністрацыйнымі ўладамі. На працягу 1933 г. сябры арганізацыі адчынілі 33 бібліятэкі-чытальні, правялі каля 10 лекцый на вёсках і зладзілі 4 спектакля вандроўнага тэатра [52, арк. 24; 53, с. 1]. Аднак неўзабаве ўнутры ТБА ўзнік канфлікт паміж двума лідарамі «беларускай санацыі» – Р. Астроўскім і А. Луцкевічам. Можна дапусціць, што асноўнай прычынай гэтага канфлікту былі амбіцыйныя памкненні Астроўскага адносна лідарства ў групе. Таксама яшчэ адной прычынай магла стаць распрацоўка далейшай стратэгіі працы. А. Луцкевіч разам са сваімі прыхільнікамі выступаў за пошук кампрамісаў з беларускімі хрысціянскімі дэмакратамі і іншымі нацыянальна-дэмакратычнымі суполкамі, а Астроўскі, са свайго боку, заклікаў працягваць лінію супрацоўніцтва з уладамі [4, s. 71]. Акрамя гэтага, да канфлікту яшчэ дадалося раскрыццё фінансавых злоўжыванняў Р. Астроўскага. Грамадскі суд, які праходзіў у 1934–1935 гг. паміж паплечнікамі Луцкевіча і Астроўскім, вынес пастанову не на карысць апошняга, падкрэсліўшы, што той «хаатычна і арбітральна» распараджаўся грашыма розных беларускіх устаноў [51, арк. 211]. Гэты раскол прадвызначыў далейшы заняпад «беларускай санацыі». У 1936 г. улады перасталі выдаваць субсідыі для ТБА, а ў наступным годзе таварыства было афіцыйна ліквідавана [52, арк. 9].

Такім чынам, у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд дзейнічаў шэраг беларускіх арганізацый праўрадавай арыентацыі. Гэтыя арганізацыі ў палітычных праграмах заклікалі беларусаў лаяльна адносіцца да польскіх уладаў, змагацца супраць беларускіх прасавецкіх і нацыянальна-дэмакратычных груп, актыўна супрацоўнічаць з польскім грамадствам. Аднак беларускія паланафілы не змаглі арганізацыйна ўзмацніць свае пазіцыі ў заходнебеларускім грамадска-палітычным жыцці. Фактычна ўся іх дзейнасць абмяжоўвалася лакальным асяроддзем Вільні, а правінцыйныя аддзелы некаторых арганізацый былі недзеяздольны ўплываць на настроі насельніцтва. Слабасць праўрадавай рыторыкі шмат у чым была абумоўлена палітыкай нацыянальнага ўціску беларусаў, ад-

сутнасцю ва ўладаў рэальнага плана сацыяльных і эканамічных рэформаў ва ўсходніх ваяводствах. Гэтыя акалічнасці цалкам нівілірывалі паланафільскую прапаганду і дазвалялі левым і нацыянальна-дэмакратычным сілам актыўна пашыраць свой уплыў на беларускае насельніцтва.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Чарнякевіч, А. Беларускія паланафілы і Грамада. 1925 – пачатак 1927 г. / А. Чарнякевіч // Гіст. альманах. – 2006. – Т. 12. – С. 64–78.

2. Пашкевіч, А. В. Беларускія паланафільскія арганізацыі і дзеячы падчас парламенцкіх выбараў у Польшчы ў 1922 г. / А. В. Пашкевіч // Problemy cywilizacyjnego rozwoju Białorusi, Polski, Rosji i Ukrainy od końca XVIII do XXI wieku / Pod red. P. Franaszka, A. N. Nieczuchrina. – Kraków : Wyd-wo Uniwersytetu Jagiellońskiego, 2007. – S. 161–164.

3. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч – Брэст, БрДУ. – 2008. – 319 с.

4. Gomółka, K. Białoruskie partie i organizacje prorządowe w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 1997. – № 7. – S. 63–74.

5. Januszewska-Jurkiewicz, J. Stosunki narodowościowe na Wileńszczyźnie w latach 1920–1939 / J. Januszewska-Jurkiewicz. – Katowice : Wyd-wo Uniwersytetu Śląskiego, 2010. – 710 s.

6. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). – F. 22. Ap. 1. B. 42.

7. LCVA. – F. 15. Ap. 2. B. 483.

8. Nie za harami // Jednaść. – 1921. – № 10. – S. 1.

9. Nasze credo // Jednaść. – 1921. – № 1. – S. 1.

10. Што зрабіла Краёвая сувязь Беларускаму Грамадзянству за апошнія два месяцы // Раніца. – 1922. – № 4. – С. 3–4.

11. Стэнаграма З'езду Зах. Беларусі // Раніца. – 1921. – № 1. – С. 2–3; № 2. – С. 2.

12. Пашкевіч, А. В. Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (1921 – 1930 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. В. Пашкевіч. – Мінск, 2006. – 162 л.

13. Кароткі нарыс беларускага пытаньня. – Мінск : Логвінаў, 2009. – 396 с.

14. Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі імя Я. Коласа. Аддзел рэдкай кнігі і рукапісаў. – Ф. 4. Воп. 1. Спр. 61.

15. Беларускі З'езд // Беларускі шлях. – 1922. – № 2. – С. 3.

16. Чівектіме. Новыя сілы / Чівектіме // Беларускі шлях. – 1922. – № 6. – С. 2.

17. Zdradniki Baćkauščyny // Krynica. – 1922. – № 9. – S. 2.

18. Niomaniec. Kalectwa biełaruskich dzietak / Niomaniec // Krynica. – 1923. – № 8. – S. 5.

19. «Польская партыя» ў Беларускім Грамадзкім Сабраньні // Голас Беларуса. – 1924. – № 18. – С 1–2.

20. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГр). – Ф. 662. Воп. 2а. Спр. 8.

21. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 189.

22. Нашая праграма // Беларус. слова. – 1926. – № 1. – С. 1.

23. Паўлюкевіч, А. Хто вінавайцы? / А. Паўлюкевіч // Грамадскі голас. – 1925. – № 23. – С. 2–3.

24. LCVA. – F. 15. Ap. 2. B. 232.

25. ДАГр. – Ф. 662. Воп. 3. Спр. 11.

26. Лідчанін. Трэйцяга мая ў Лідзкай царкве / Лідчанін // Беларус. справа. – 1926. – № 7. – С. 6.

27. «Ацец духоўны» стараецца! // Наш голас. – 1927. – № 10. – С. 4.
28. Хмара, С. Кароткія даныя аб сабе / С. Хмара [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://belarus8.tripod.com/ZapisyBINIM/24.05.htm. – Дата доступу: 14.05.2014.
29. LCVA. – F. 53. Ap. 23. B. 831.
30. Зьезд Заходняй Беларусі // Беларус. слова. – 1926. – № 20. – С. 1–4.
31. LCVA. – F. 53. Ap. 23. B. 778.
32. A-lis. Gudai, lenkų politika ir mes / A-lis // Vilniaus Aidas. – 1927. – № 52. – С. 1.
33. Аляхновіч, Ф. У капцюрох ГПУ / Ф. Аляхновіч. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 283 с.
34. Informator społeczno-polityczny Województwa Wileńskiego. – Wilno, 1927. – Zesz. 4, Roz. 3. – S. 3–23.
35. Smreczyński, K. Konferencja polonofilskiej grupy F. Umiastowskiego / K. Smreczyński // Kurjer Wileński. – 1927. – № 256. – S. 2.
36. БДАМЛіМ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 213.
37. З жыцьця Беларускае Радыкальнае Народнае Партыі // Беларус. дзень. – 1927. – № 35. – С. 2–3.
38. LCVA. – F. 51. Ap. 7. B. 296.
39. Умястоўскага «агітатары» працуюць // Голас працы. – 1928. – № 1. – С. 6.
40. Czerniakiewicz, A. Raporty Romualda Ziemkiewicza z lat 1923–1925 / A. Czerniakiewicz // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2007. – № 27. – S. 224–275.
41. ДАГр. – Ф. 551. Воп. 1. Спр. 974.
42. ДАГр. – Ф. 664. Воп. 3. Спр. 8.
43. Луцкевіч, А. Да гісторыі беларускага руху / А. Луцкевіч. – Беласток : Беларус. гіст. тав-ва ; Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2010. – 342 с.
44. Склубоўскі, В. З мінулых год / В. Склубоўскі // Ніва (Беласток). – 1982. – № 25. – С. 4–5.
45. Сідарэвіч, А. Хроніка пераломнага часу: Антон Луцкевіч як ідэолаг і правадыр нацыянал-фашызму і нацыянал-дэмакратыі / А. Сідарэвіч // Дзеяслоў. – 2004. – № 8. – С. 167–194.
46. Эра [Астроўскі, Р.]. Яшчэ адна – можа апошняя – спроба / Эра [Р. Астроўскі] // Наперад. – 1930. – № 21. – С. 1.
47. Ладысеў, У. Ф. Паміж Усходам і Захадам. Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. – Мінск : БДУ, 2003. – 307 с.
48. Туронак, Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі / Ю. Туронак. – Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2006. – 877 с.
49. LCVA. – F. 53. Ap. 23. B. 2078.
50. Цэнтрасаюз і яго праца // Беларус. каляндар на 1932 г. – Вільня, 1932. – С. 43–44.
51. БДАМЛіМ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 270.
52. LCVA. – F. 53. Ap. 23. B. 2005.
53. За мінулы год // Родны край. – 1933. – № 25. – С. 1.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 25.06.2014

***Gorny A.S.*** **Belarusian Polonophilic Organization in Western Belarus (1921–1937): Organizational Structure and Program**

*In the article is considering the problem of activity of Belarusian polonophilic organizations in Western Belarus in the interwar period. The main attention is paid to the analysis of the organizational structure of the polonophilic flow in Belarusian movement and review the political programs of Krajovaja suviaz, Temporary Belarusian Council, Belarusian radical People's Party, group a Lutskievich – Astrouski and other organizations. The author pointed low impact belarusian polonophilic organizations on the socio-political life in Western Belarus.*